*Кнігарня*

# ШТО ХВАЛЮЕ ПАЭТА

Год колькі таму, калі ў нашай вобласці рэгулярна праводзілася літаратурнае свята «Над Дняпром, Дзвіной і Сожам» з удзелам пісьменнікаў з Мінска і з трох абласцей-суседак - Гомельскай, Бранскай і Чарнігаўскай, то на адным з іх прысутнічаў паэт Алесь Дуброўскі, ціхмяны, нетаропкі і разважлівы. Мне добра запомнілася гэта. І вось чаму. Калі прадаставілі яму слова для выступления перад аўдыторыяй, ён прачытаў верш, прысвечаны памяці паэта Анатоля Грачанікава, які заканчваўся наступнымі радкамі:

*...Не пачуў,*
*І падаўся, нібы на прынаду.*
*Магістраль пакаціла ў самае пекла.*
*Каб Шарпілаўка ведала города здраду,*
*То сякераю шпалы на трэскі б пасекла...*

Пэўны час было маўчанне. Пісьменнікі, ды і многія з прысутных у зале, мабыць, узгадалі паэта-земляка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі, які так рана, у росквіце таленту і пры не высветленых да канца абставінах пайшоў з жыцця. А паэт Браніслаў Спрынчан, з якім я сядзеў побач, паказаў вачыма на А.Дуброўскага: «Добры паэт. А дзе ж ён раней быў?»

Раней Алесь Дуброўскі вучыўся ў сваёй роднай Целяшоўскай сярэдняй школе Гомельскага раёна, працаваў на будоўлі, пазней скончыў ГДУ імя Ф.Скарыны, адразу быў запрошаны на працу ў раённую газету «Маяк». Сёння ён - рэдактар падрыхтоўкі тэлевізійных праграм у тэлерадыёкампаніі «Гомель».

Адразу заўважу: у Беларусі ёсць два паэты Алеся Дуброўскія. Той, другі, і ўзростам значна маладзейшы, і жыве ён у сталіцы. Аднойчы з Алесямі такая аказія атрымался. Часопіс «Маладосць» надрукаваў добрую падборку (там быў, дарэчы, змешчаны і верш, прысвечаны А.Грачанікаву), нататку (дзе нарадзіўся, вучыўся, друкаваўся) нашага Алеся Дуброўскага, а фотаздымак далі Алеся-мінчука. Такі ляп адразу ж, вядома, стаў здабыткам мас. На што А.Дуброўскі спакойна адказваў: «Шкада, канешне, што так атрымалася. Але галоўнае ўсё ж, што вершы надрукаваны мае. Выйграў, пагадзіся, я, а не той Дуброўскі, з Мінску...А вершы наогул можна друкаваць без партрэтаў...».

Публікацыі ў «Маладосці», прыгадваю, гомельскі паэт чакаў тады з нейкім асаблівым нецярпеннем, хоць гэтая рыса не ўласціва ягонаму характару. Нібы хацеў сам здзівіцца, адгарнуўшы старонку часопіса... Дарэчы, так і не выйшла ў бібліятэчцы «Маладосці» кніжка вершаў А.Дуброўскага, хаця была ўхвалена і падрыхтавана да друку. І тут, можна сказаць, не пашанцавала: неўзабаве дадатак наогул заказаў доўга жыць. Але паэт усё ж прыйшоў да чытача, хаця нельга сказаць, што не прыходзіў раней - яго вершы зрэдку друкаваліся ў часопісах і газетах. Прыйшоў шырокім, упэўненым крокам. Спярша пабачыла свет яго першая кніжка «І будзе лета апасля...» (2005 г., «Барк», Гомель), а сёлета - другая: «Непрадсказальнасць дня», выдадзеная там жа пры непасрэдным удзеле аднаго і таго ж чалавека - Мілы Беразоўскай, якую ў апошні час можна ўсё часцей бачыць на розных пісьменніцкіх імпрэзах. За што ёй дзякуй. Першая і другая кнігі выдадзены прыстойна, на добрым паліграфічным узроўні.

Новая кніга вершаў А.Дуброўскага - гэта паэзія шырокага грамадзянскага гучання.

Аўтара хвалююць самыя розныя жыццёвыя праблемы, ён акцэнтуе ўвагу, вядома ж, на значных, балявых момантах. У сённяшні імклівы час няпроста паэту знайсці нешта сваё, няпроста не паўтарыцца. Нехта з крытыкаў справядліва падкрэсліў, ды мы і самі гэта бачым, што паэтаў у нас больш чым шмат, і гэта, мусіць, добра, але ў такім хоры можна абавязкова пачуць голас, які дойдзе да цябе, не пакіне раўнадушным, закране тваё сэрца. Не толькі мелодыяй гучання, ён заварожыць атмасферай, у якую адразу ж, з першых радкоў, трапляеш. Атмасферай утульнасці, паразумення і чыстага, светлага спакою.

*Мне хочацца параіцца*
*Не з вечарам, а з раніцай:*
*Яна мудрэй мяне ўдвайне...*
*А дзень, што нараджаецца,*
*Пацвердзіць пастараецца,*
*Памылак я пазбег*
*Ці не...*

На любы густ можа знайсці чытач верш у зборніку. І аб каханні, і аб мінулай вайне, якая, вядома ж, не абмінула сваім крылом самых блізкіх паэту людзей, і проста - пра наша з вамі жыццё, такое markдзнае, шматколернае.
Трапляюцца і ўдалыя іранічныя радкі.

Канешне ж, не мог абмінуць у сваіх творах паэт пару дзяцінства — самы, відаць, шчаслівы і незабыўны час для кожнага чалавека. Гэта недзе там, у яго родных Целяшах, «Як мячык, падскочыў яблык апалы... а мне падалося, што матулі-зямлі захацелася пагушкаць яго, як непаслухмянае дзіця-птушаня, што незнарок сарвалася з дрэва, або такім чынам падсадзіць назад на галінку...»

Змешчана ў зборніку і паэма «Трагедыя Пабужжа». Яна прысвечана памяці Аркадзя Набокіна - настаўніка-пенсіянера, які болын дзесяці гадоў пражыў адзін у выселенай вёсцы Пабужжа Веткаўскага раёна і быў забіты маладымі вырадкамі за ўласнае целя. Што ж тычыцца другой паэмы, «Цімох», то ёй аўтар даў падзагаловак - «3 нататкаў журналіста раёнкі». Тут ёсць шмат шчырага, дасціпнага гумару. Чытаецца твор лёгка, на адным дыханні. Як і многія іншыя творы паэта.

Можна яшчэ і яшчэ цытаваць аўтара. Але ж і па тых радках, што я прывёў у сваёй кароткай натацы (магчыма, і не самыя лепшыя радкі, бо ў кожнага свой густ, так і павінна быць), можна пераканацца, што ў Гомелі заявіў пра сябе на поўны голас яшчэ адзін цікавы, самабытны паэт.

**Дзяжурны па кнігарні - пісьменнік Васіль ТКАЧОЎ.**